торыі кнігі ў краінах свету як цэласнага працэсу. У другой частцы курса -- гісторыі сусветнай кнігі -- дадаткова матэрыял сістэматызуецца па краязнаўчаму, тыпалагічнаму і праблемнаму аспектах.

Ва ўмовах адсутнасці падручнікаў па абедзвюх частках курса і невялікай колькасці лекцыйных гадзін для падтрымання неабходнага ў межах універсітэцкага адукацыі ўзроўню выкладання матэрыялу выйсце бачыцца ва ўдасканаленні зместу і метадаў навучання, пераходзе ад фактаграфічнага да праблемнага асвятлення матэрыялу. Праблемнае асвятленне матэрыялу адзначаецца ступенню адбору, навізной матэрыялу, увядзеннем актуальнага, перспектыўнага і нават спрэчнага матэрыялу аб найбольш яскравых, асноўных з'явах, аб тэндэнцыях і заканамернасцях у развіцці кнігі. З мэтай іх ілюстрацыі прыводзяцца даты, лічбы, назвы кніг, якія з'яўляюцца грамадскай з'явай. Другі напрамак -- абмежаванне круга разглядаемых пытанняў. Гэта праблема вельмі вострая пры выкладанні гісторыі сусветнай кнігі. Тут прыярытэты аддаюцца з'явам і тэндэнцыям, якія мелі выключную ролю для ўзнікнення, станаўлення, развіцця і перспектыў існавання кнігі. Асобая ўвага звяртаецца на гістарычны матэрыял, які мае непасрэднае дачыненне да развіцця беларускай кнігі. Гэта дазваляе абмежаваць вывучаемы матэрыял з улікам гістарычных лёсаў, еднасці. Трэці напрамак -- цеснае выкарыстанне міжпрадметных сувязей: правядзенне гістарычных паралеляў з іншымі дысцыплінамі, якія адлюстроўваюць сацыяльнае асяроддзе існавання кнігі ў розныя гістарычныя перыяды, а таксама гісторыяй літаратуры, гісторыяй бібліятэчнай справы, гісторыяй бібліяграфіі. Але перш за ўсё абапіраемся на кнігазнаўства, якое выкладаецца ў межах дакументазнаўства і знаёміць з паняційным апаратам кнігі. Каб ліквідаваць дубліраванне, дакументазнаўства, на наш погляд, павінна вывучацца студэнтамі апераджальна ці паралельна з гісторыяй кнігі ў першым семестры. Максімальны перавод дысцыплін на актыўныя метады прадугледжвае стварэнне падручнікаў і іншых вучэбных метадычных матэрыялаў. Хоць гэтая работа вядзецца, але вялікая вучэбная нагрузка, адсутнасць спецыяльных стажыровак, на жаль, ёй не спрыяюць. Не ў такой ступені, як хацелася б, ёсць магчымасць уводзіць інтэнсіўныя формы навучання, бо яны не толькі не змяншаюць, а павялічваюць ужо перавышоўшую межы разумнага нагрузку выкладчыка. Ёсць іншыя праблемы. Не плануюцца бягучыя, індывідуальныя кансультацыі. Цяжкасці ўзнікаюць пры кантролі якасці працы студэнтаў, таму што кантрольную работу на стацыянары знялі.

Вялікае значэнне мае матэрыяльнае забеспячэнне вучэбнага працэсу, і сёння мы вітаем намаганні бібліятэкі універсітэта па стварэнню аддзела рэдкай кнігі, здабыткі якога можна будзе актыўна выкарыстоўваць у вучэбных мэтах. Супрацоўнікам бібліятэкі нягледзячы на арганізацыйныя і матэрыяльныя цяжкасці трэба таксама больш актыўна займацца дакамплектаваннем і своечасовым камплектаваннем неабходнай навуковай, вучэбнай і метадычнай літаратурай па курсу, якая выходзіць у Беларусі і ў іншых краінах.

Акуліч У.А.,
канд.гіст.навук,
дацэнт
Саладоўнікаў С.В.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА ЯК СРОДАК БІБЛІЯТЭРАПІІ
(некаторыя аспекты ўдасканалення падрыхтоўкі бібліятэкараў)

У лік асаблівасцей мастацкай літаратуры (пазнавальныя, выхаваўчыя, эстэтычныя) уваходзіць таксама бібліятэрапеўтычны аспект (або псіхатэрапеўтычны). Асаблівасць гэта вядома са старажытных часоў. Арыстоцель вызначыў трагедыю як ачышчэнне ад афектаў. Ён назваў гэта "катарсісам". Праўда, тэрмін "катарсіс" ужываўся і піфагарыйцамі, якія раілі звяртацца да музыкі дзеля ачышчэння душы. Апошні аспект у Беларускім універсітэце культуры можа быць выкарыстаны пры асваенні спецыялізацыі, звязанай з рэабілітацыяй сродкамі эстэтатэрапіі.

Уплыў мастацкіх твораў на чалавека складаецца з розных бакоў: мастацкае слова, вобразнасць, думка, сітуацыя, патрабуючая глыбокіх разважанняў, маральны сэнс твора і г.д. Вынікам сапраўды часта з'яўляецца ачышчэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад афектаў, якія так ці гэтак прыгнятаюць чалавека, гарманізацыя пачуццяў і стану душы. Чытач можа знайсці ў творы свайго рода лекі: гераіня аповесці Бакачыо "Элегія мадоны Ф'яметы", каб справіцца са сваім горкім становішчам (яе кінуў каханы), пачынае чытаць гісторыі пра жанчын з антычнага эпасу, якія аказваліся ў цяжкім становішчы (Дыдона, Пенелопа, Гекуба. Арыядна). Дарэчы кажучы, Бакачыо лічыў, што той, хто прачытае "Дэкамерон", будзе лягчэй перамагаць любоўныя пакуты.

Гэта тэрапеўтычнасць кнігі ў чыстым выглядзе. Калі ж разглядаць розныя аспекты ўплыву кнігі на чытача, то трэба вызначыць і апавядальна-займальны. Вядома, што праз займальнасць формы часта пісьменнікі праводзяць вельмі слушныя думкі. Ды і нашы продкі ў далёкай старажытнасці падымалі свой настрой, слухаючы ля вогнішчаў цікавыя паляўнічыя ці баявыя гісторыі, апавяданні пра цікавыя здарэнні. "Хэпі энд", шчаслівыя канцоўкі ў літаратурных творах, уяўляюць сабой яскравы прыклад таго, як пісьменнікі клапоцяцца аб маральным здароўі грамадства і асобы. Калі б злодзея ў канцы п'есы не пасцігла кара, калі б злачынца ў фінале дэтэктыву ці трагедыі не чакала спагнанне, мараль грамадства панесла бы страты, узнікла б напружанасць. Гэта яшчэ адзін прыклад бібліятэрапіі.

На наш погляд, бібліятэрапія накіравана на аказанне індывідуальнай псіхалагічнай рэабілітацыі шляхам мэтанакіравана падабранага чытання для вырашэння асабістых праблем. Бібліятэкі заўсёды займаліся бібліятэрапіяй. Першае ўпамінанне аб бібліятэрапіі адносіцца каля 1300 г. да н.э. На кнігасховішчы бліз Фіў Рамзеса II у старажытным Егіпце было высечана "Аптэка для душы". Асабліва актуальна бібліятэрапія цяпер, калі жыхары нашай рэспублікі адчуваюць сябе псіхалагічна не вельмі ўстойліва. І адна з задач бібліятэрапіі аказваць дапамогу чытачам, трапіўшым у складаную жыццёвую сітуацыю. І мы лічым, што выкладаць бібліятэрапію на ФБІС трэба абавязкова.

Такім чынам, справа заключаецца ў метадычнай сістэме. Яна можа мець наступны выгляд. Чытаецца на ФБІС агульны курс сусветнай літаратуры (з падраздзяленнем на рускую, беларускую, заходнееўрапейскую, амерыканскую і г.д.). У гэтым курсе высвятляюцца заканамернасці развіцця літаратуры, яе гісторыя. Далей ідуць спецкурсы. Пры падрыхтоўцы спецкурсаў выкарыстоўваюцца міжпрадметныя сувязі. Кафедры бібліятэказнаўства і сусветнай літаратуры, псіхалогіі і гісторыі, філасофіі могуць тут супрацоўнічаць. Калі ж звяртацца да музычных аспектаў (у творах Р.Ралана, Т.Мана, Э.Гофмана), то неабходна супрацоўніцтва з музычнымі кафедрамі.

Яркім бібліятэрапеўтычным эфектам можа валодаць спецкурс па гістарычнаму раману. Апісанні розных эпох, апісанні розных краін, нораваў, звычаяў людзей, палітычна-грамадскіх падзей павінны ўносіць у светапогляд чалавека больш сціпласці, разумнай рэакцыі на ўчынкі людзей, а гэта прама вядзе да душэўнага здароўя.

Спецыяльны і паслядоўны аналіз навуковай фантастыкі выводзіць студэнта (калі браць шырэй -- чытача) на глабальныя праблемы экало-гіі, космасу, чалавека як разумнай істоты, на праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ведаючы паэтыку навуковай фантастыкі, студэнт не напалохаецца інфармацый пра палтэргейсты, НЛА, "жыццё пасля смерці", зданi і ўсялякія цуды.

Спецкурс "Чалавек у сям'і і грамадстве" можа ахапіць вялікі шэраг вельмі складаных праблем: каханне, брак і сям'я, адносіны людзей розных культур. Тэмамі спецкурсаў могуць быць аналіз паводзін чалавека ў экстрэмальных сітуацыях, матэрыяльнае і духоўнае жыццё і смерць, роля выпадку ў жыцці.

У працэсе аналізу літаратурных твораў студэнты па спецкурсу могуць выконваць пісьмовыя працы з мэтай, што па гэтых тэмах потым, працуючы ў бібліятэках, яны змогуць правесці канкрэтныя мерапрыемствы, гутаркі з чытачамі і г.д.

Такім чынам, выкарыстоўванне спецыяльнага аспекта мастацкай літаратуры, яе бібліятэрапеўтычных якасцей будзе садзейнічаць удасканаленню падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ